грамад. навук. 1976. № 4. С. 109 - 110.
13. ЦГИА СССР. Ф. 229. Оп. 4. Д. 1704. Л. 24.

**М. М. Забаўскі, У. С. Пуцік**

## РАСІЙСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ ДУМА І СКЛІКАННЯ Ў ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫМ ЖЫЦЦІ БЕЛАРУСІ

На працягу дзесяцігоддзяў у савецкай гістарыяграфіі дамінавала тая ідэя, што ў адрозненне ад іншых краін свету Расійскай імперыі на пачатку XX стагоддзя быў фатальна прадвызначаны рэвалюцыйны шлях развіцця і ніякіх надзей на рэфармісцкі шлях у яе не заставалася. Гэты пункт гледжання матываваўся сацыяльна-эканамічнай абумоўленасцю прагрэсу грамадства, асобнымі якасцямі як пралетарыяту, так і буржуазіі, якая не мела неабходнай палітычнай арганізацыі. Ды і сама гісторыя сведчыла пра тое, што ўрадавыя колы ішлі на ўступкі пад магутным націскам знізу: так было ў 1905 годзе і двойчы ў 1917-м. Пасля падзей крывавай нядзелі 9 студзеня 1905 года стала зразумела, што дасягнуць вызвалення можна толькі рэвалюцыйным шляхам.

Чым жа была Дзяржаўная дума 90 гадоў таму назад, якое месца займала яна ў альтэрнатыве рэвалюцыйнаму шляху і, урэшце, якое дачыненне мела да Беларусі (Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай губерняў)?

Дзяржаўная дума ў Расіі - прадстаўнічы заканадаўчы орган, сярод дэпутатаў якога меліся і выразнікі інтарэсаў працоўных. Яна была створана царскім самадзяржаўем ва ўмовах рэвалюцыі 1905 года з мэтай папярэдзіць новы рэвалюцыйны выбух і вырашыць галоўныя пытанні грамадска-палітычнага жыцця краіны: аграрнае, нацыянальнае, рабочае ды інш., захоўваючы пры гэтым і асновы царскага рэжыму. Першая спроба выдаць закон аб выбарах у Дзяржаўную думу была зроблена царскім урадам 6 жніўня 1905 года, але ва ўмовах уздыму рэвалюцыі поспеху не мела.

11 снежня 1905 года ўрад выдаў новы выбарчы закон. Ён некалькі пашыраў кола выбаршчыкаў у параўнанні з "Палажэннем аб выбарах у Дзяржаўную думу" ад 6 жніўня. Да трох выбарчых курый -

землеўладальніцкай, гарадской і сялянскай далучалася чацвёртая-рабочая. Права ўдзельнічаць у выбарах давалася толькі рабочым прадпрыемстваў фабрычна-завадской, горнай прамысловасці, а таксама чыгуначных майстэрань з агульнай колькасцю рабочых-мужчын не менш як 50 чалавек. Ад удзелу ў выбарах былі адхілены гандлёвыя служачыя, прыказчыкі, прадаўцы, конначныя, трамвайныя, чыгуначныя рабочыя (акрамя майстэрань), жанчыны, ваеннаслужачыя.

Поўная перавага на выбарах была забяспечана памешчыкам і буйной буржуазіі. Адзін голас памешчыка адпавядаў 3,5 галасам гарадской буржуазіі, 15 галасам сялян і 45 галасам рабочых. Выбары для працоўных былі шматступенныя [1].

Выбарчая кампанія ў Думу выклікала шырокі грамадскі рух. Разгарнулася вострая барацьба розных сацыяльных і палітычных сіл па пытанні аб адносінах да яе. Гэта было першае адкрытае выступленне на палітычнай арэне створаных у ходзе рэвалюцыі партый і груп. На Беларусі такая барацьба мела свае спецыфічныя асаблівасці.

Актыўную дзейнасць разгарнулі прадстаўнікі мясцовай буржуазіі, памешчыкаў, якія раздзяліліся паводле нацыянальнай прыналежнасці. Рускія памешчыкі аб'ядналіся ў партыю "17 кастрычніка". Да іх далучылася праваслаўнае духавенства і рускія чыноўнікі. Яны выступалі абаронцамі інтарэсаў самадзяржаўя на ўскраінах пад лозунгам "адзінай і непадзельнай Расіі". Блізкай да іх была партыя прававога парадку. Акцябрысты і праваparадцы выступалі разам з чарнасоценцамі, прапагандавалі вялікадзяржаўны шавінізм, распальвалі нацыянальную і рэлігійную варожасць сярод насельніцтва. На выбарах яны пацярпелі паражэнне.

На пачатку 1906 года быў створаны Польскі выбарчы камітэт землеўладальнікаў. Яго аснову складала Віленскае сельскагаспадарчае таварыства. Актыўны ўдзел у выбарах прыняло каталіцкае духавенства. У Мінскай губерні быў створаны Прагрэсіўны блок, у які ўвайшлі кадэты і нацыянальныя дэмакраты (эндэкі). Вялікага поспеху польскія камітэты дабіліся на выбарах ў Віленскай і Мінскай губернях.

Тактыку байкоту праводзілі бальшавікі. Сяляне ў асноўнай сваёй масе прынялі ўдзел у выбарах. Не ўдзельнічалі ў выбарах эсэры і БСГ, байкатаваў іх Бунд, але выбары адбыліся. Іх канчатковыя вынікі вызначаліся і ходам усей выбарчай кампаніі, і

палітычнымі камбінацыямі на губернскіх выбарчых сходах.

Ад Віленскай губерні, дзе моцны ўплыў на выбаршчыкаў рабіла каталіцкае духавенства, у Дзяржаўную думу былі абраны: К. К. Александровіч, 1866 г. н., селянін Трокскага павета, па палітычных поглядах далучыўся да трудавой групы (трудавікі); М. С. Гатавецкі, 1858 г. н., селянін Лідскага павета, скончыў народнае вучылішча, далучыўся да трудавікоў; М. М. Грынцэвіч, 1862 г. н., селянін Свянцянскага павета, скончыў народнае вучылішча, беспартыйны; епіскап барон Э. Ю. Роп, памешчык Свянцянскага павета, атрымаў вышэйшую адукацыю, належаў да краёўцаў; Б. А. Ялавецкі, 1848 г. н., памешчык Свянцянскага павета, скончыў Мікалаеўскую інжынерную акадэмію, 15 гадоў кіраваў Аляксандраўскім механічным заводам, належаў да краёўцаў; І. К. Янкоўскі, 1857 г. н., памешчык Ашмянскага павета, скончыў Варшаўскі і Кракаўскі універсітэты, са снежня 1906 года - рэдактар-выдавец газеты "Літоўскі кур'ер" у Вільні, прагрэсіст; Ш. Х. Левін, 1867 г. н., скончыў Кёнігсбергскі універсітэт, член цэнтральнага бюро расійскай сіяністкай арганізацыі, належаў да кадэтаў і да яўрэйскай групы.

З Віцебскай губерні у Думу прайшлі: Г. Я. Брук, 1869 г. н., урач, скончыў Кіеўскі універсітэт, член выканаўчых камітэтаў сіяністкіх кангрэсаў, грамадскі равін, рэдактар газеты "Витебская жизнь", належаў да партыі кадэтаў; А. А. Валковіч, 1856 г. н., мешчанін, старэйшы гласны Віцебскай гарадской думы, належаў да кадэтаў; Ф. С. Трасун, 1864 г. н., ксёндз, скончыў рымскакаталіцкую духоўную акадэмію, выдавец латышскай газеты "Аусеклис", далучыўся да кадэтаў; Р. Ф. Філіпаў, 1872 г. н., селянін Полацкага павета, далучыўся да кадэтаў; П. І. Перасвет-Солтан, 1866 г. н., памешчык Полацкага павета, скончыў Маскоўскі універсітэт, належаў да краёўцаў; Б. Б. Шахно, 1868 г. н., памешчык Дзвінскага павета, скончыў Дэрпцкі універсітэт, належаў да краёўцаў.

Ад Гродзенскай губерні ў Думу былі абраны: У. Р. Якубсон, 1861 г. н., прысяжны паверанны з г. Слоніма, скончыў Пецярбургскі універсітэт, сіяніст, належаў да трудавікоў; М. М. Ярогін, 1862 г. н., скончыў Мікалаеўскую акадэмію Генеральнага штаба, прагрэсіст; М. М. Жукоўскі, 1864 г. н., селянін Беластоцкага павета, вучыўся ў народнай школе, валасны старшыня, належаў да трудавікоў; С. П. Кандрашук, 1876 г. н., селянін Брэсцкага павета, скончыў

народнае вучылішча, далучыўся да трудавікоў; А. В. Курпацкі, 1864 г. н., селянін, скончыў народнае вучылішча, належаў да трудавікоў; М. Я. Астрагорскі, 1854 г. н., скончыў Пецярбургскі універсітэт, належаў да кадэтаў; А. Н. Сангайла, 1867 г. н., ксёндз з Пружан, належаў да краёўцаў.

Дэпутатамі ад Мінскай губерні ў І Дзяржаўную думу былі абраны: У. Э. Друцкі-Любецкі, 1861 г. н., палескі памешчык, скончыў Пецярбургскі універсітэт, належаў да краёўцаў; А. Р. Лядніцкі, 1866 г. н., скончыў Маскоўскі універсітэт, займаўся адвакатурай у Маскве, адзін з заснавальнікаў кадэцкай партыі, належаў таксама і да групы краёўцаў; Я. П. Любанскі, 1859 г. н., адзін з буйнейшых памешчыкаў Паўночна-Заходняга края, скончыў земляробчую каралеўскую акадэмію, вядомы грамадскі дзеяч г. Мінска, па палітычных поглядах быў прыхільнікам кадэтаў; С. Я. Розембаўм, 1859 г. н., прысяжны паверены, лідэр сіяніскага руху ў Расіі, далучаўся да кадэтаў; Р. А. Скірмунт, 1868 г. н., памешчык Пінскага павета, скончыў Рыжскую гімназію, па палітычных поглядах з'яўляўся прыхільнікам прагрэсістаў, належаў да краёўцаў; Я. Я. Вішнеўскі, землеўладальнік, меў вышэйшую адукацыю, належаў да краёўцаў; П.-М. П. Масоніус, 1862 г. н., скончыў Варшаўскі і Лейпцыгскі універсітэты, доктар філасофіі, з'яўляўся рэдактарам выдавецтва "Книжка", "Варшаўскай газеты" і газеты "Реформа"; В. В. Янчэўскі, гласны Мінскай гарадской думы, у Мінску меў надзвычай высокі аўтарытэт, прымаў удзел у некалькіх мясцовых грамадскіх установах, быў прыхільнікам кадэтаў.

Ад Магілёўскай губерні ў І Думу з сямі дэпутацкіх месцаў пяць занялі сяляне: В. А. Каранькоў, 1872 г. н., Аршанскі павет, атрымаў ніжэйшую адукацыю, беспартыйны; М. І. Аўсяннікаў, 1861 г. н., Рагачоўскі павет, беспартыйны; М. Е. Сямёнаў, 1872 г. н., Сенненскі павет, скончыў народнае вучылішча, прыхільнік партыі кадэтаў; А. І. Сакалоўскі, 1877 г. н., Мсціслаўскі павет, скончыў народнае вучылішча, спрыяў кадэтам; Ф. С. Гуслаў, скончыў Гомельскае чыгуначнае вучылішча, далучыўся да трудавікоў. Ад гарадскіх выбаршчыкаў былі абраны: Р. М. Цвёрды, 1871 г. н., адзін з кіраўнікоў газеты "Магілёўскі голас", і А. Я. Хамянтоўскі, 1859 г. н., абодва скончылі Пецярбургскі універсітэт, абодва належалі да партыі кадэтаў [2].

У выніку з 36 дэпутатаў ад 5 заходніх губерняў 29 прайшлі ў

Думу пад кадэцкімі лозунгамі пры падтрымцы канстытуцыйна-каталіцкай партыі, сіяністаў і "Саюза дасягнення раўнапраў'я яўрэяў у Расіі", 5 (усе сяляне) адносілі сябе да беспартыйных, 1 - да сацыял-дэмакратаў і 1 - да правых (апошнія таксама сяляне). З агульнага ліку дэпутатаў памешчыкаў было 10 (28%), святароў-5 (14%), чыноўнікаў - 8 (22%), сялян - 13 (36,1%).

I Дзяржаўная дума пачала працаваць 27 красавіка 1906 года. Адкрыццё праходзіла ў Таўрыцкім палацы, але тронная прамова імператара адбывалася ў Зімнім палацы. Адкрыў работу Дзяржаўнай думы статс-сакратар Э. В. Фрыш, ён жа прапанаваў абраць старшыню Думы. Амаль што адзінагалосна ім стаў С. А. Мурамцаў.

Цэнтральным пытаннем у Думе было аграрнае. Кадэты вынеслі на абмеркаванне свой аграрны законапраект за подпісам 42 дэпутатаў, дзе прадугледжвалася павелічэнне сялянскага землекарыстання за кошт казённых і удзельных зямель, частковае адчужэнне памешчыцкіх зямель з узнагароджваннем уладальнікаў "па справядлівай ацэнцы". Мелася на ўвазе адчужэнне тых зямель, якія здаваліся ў арэнду да 1 студзеня 1906 года ці не апрацоўваліся зусім, хоць і былі прыгоднымі для таго. Землі гэтыя павінны былі скласці дзяржаўны зямельны фонд і перадавацца сялянам у доўгатэрміновую арэнду па спажывецкай норме, якая забяспечвала сялянскай сям'і пражытачны мінімум. Землі, не адчужаныя ў памешчыкаў, а таксама надзельныя сялянскія, заставаліся ў асабістай уласнасці. Дадзенае патрабаванне па сутнасці не супярэчыла інтарэсам памешчыкаў [3]. Яны атрымлівалі магчымасць выгадна для сябе прадаць сялянам тыя землі, якія здаваліся імі ў арэнду ці зусім не апрацоўваліся.

Большасць сялянскіх дэпутатаў Думы не пайшлі за кадэтамі і стварылі самастойную фракцыю - трудавую групу. Ад заходніх губерняў у яе ўвайшлі 6 чалавек: К. А. Александровіч, М. С. Гатавецкі, М. М. Жукоўскі, С. П. Кандрашук, Ф. Я. Буслаў, Р. Ф. Філіпаў. Да іх далучыўся селянін А. І. Сакалоўскі. Такім чынам, 7 сялян з 13 выбраных у Думу ад заходніх губерняў перайшлі на бок трудавікоў.

Трудавікі ўнеслі на разгляд Думы свой зямельны праект 104-х. Гэтым праектам прадугледжвалася прымусовае адчужэнне памешчыцкіх зямель і стварэнне агульнанароднага зямельнага фонду, у які былі б уключаны ўсе казённыя, кабінецкія, царкоўныя, а таксама прымусова адчужаныя прыватнаўласніцкія землі, што пера-

вышалі працоўную норму. Падрыхтоўку і правядзенне рэформы трудавікі меркавалі даручыць мясцовым зямельным камітэтам, выбраным на аснове ўсеагульнага выбарчага права пры тайным галасаванні, г.зн. самім сялянам. Ад Беларусі зямельны праект 104-х падпісалі Ф.Я.Буслаў, А.І.Сакалоўскі, М.С.Гатавецкі і К.А.Александровіч.

24 мая ў Думе была заслухана заява 35 членаў трудавой групы аб неадкладным стварэнні на месцах камітэтаў для падрыхтоўкі і правядзення зямельнай рэформы. Ад заходніх губерняў праект 35-ці падпісаў селянін С.М.Кандрашук. Дэпутат-селянін М.І.Грынцэвіч падкрэсліў, што сяляне, задыхаючыся на дробных кавалачках зямлі, вымушаны ісці ў цяжкую кабалу да памешчыкаў. Селянін-трудавік М.М.Жукоўскі паведаміў пра тое, што з Гродзенскай губерні ад бязвыхаднасці малазямельныя сяляне з сем'ямі штогод ад'язджаюць у Амерыку, ідуць у гарады, каб ўратавацца ад голаду.

Пункт гледжання большасці сялян Беларусі на формы землекарыстання найбольш яскрава раскрыў дэпутат С.П.Кандрашук: "Што тычыцца карыстання зямлёй, то яна павінна быць у спадчынным карыстанні і пераходзіць ад роду да роду, а прадметам гандлю зямля ніколі не павінна быць, а як ёю валодаць, падворна, хутарам ці абшчынамі, то такое права трэба перадаць мясцовым таварыствам" [4]. З сямі выступоўцаў сялян-дэпутатаў ад беларускіх губерняў двое (М.М.Жукоўскі, М.С.Гатавецкі) цалкам выказаліся на карысць асабістай уласнасці. Яны выражалі інтарэсы заможнай часткі сялян, да якой належалі самі. Гатавецкі, заканчваючы сваю прамову, падкрэсліў: "Падымецца ўсё сялянства царства Польскага з ружжамі і каламі на абарону святой прыватнай уласнасці на зямлю, пранізаўшай яго светапогляд" [4].

Прыкметную актыўнасць пры абмеркаванні аграрнага пытання праявілі дэпутаты-памешчыкі Беларусі. Яны адстойвалі прынцып недатыкальнасці асабістай уласнасці і вырашэння аграрнага пытання аўтаномна, ізалявана ад іншых рэгіёнаў імперыі. Найбольш поўна пазіцыю памешчыкаў Беларусі выклаў у сваёй прамове Р.А.Скірмунт. Ён выказаўся супраць адчужэння памешчыцкіх зямель, спасылаючыся на тое, што гэта вымусіць вялікіх выдаткаў і неспрыяльна адаб'ецца на становішчы дзяржавы. На яго думку, парушэнне ці адмена прынцыпу прыватнай уласнасці на зямлю прынясе незлічоныя беды насельніцтву і дзяржаве, бо прывядзе да засілля бюракратыі, выкліча незадавальненне сялян, пазбавіць іх заробку, прывядзе да

заняпаду прамысловасці і культуры, да банкруцтва дзяржавы.

Р. А. Скірмунта падтрымаў Б. А. Ялавецкі, які паставіў вырашэнне аграрнага пытання ў залежнасць ад рашэння аб аўтаноміі. Ксёндз з Пружан А. М. Сангайла таксама заявіў: "Пра нацыяналізацыю і дзяржаўны фонд ў нашых заходніх губернях і размовы не можа быць. Дайце нам магчымасць вырашыць гэта пытанне ў сябе дома". Найбольш выразна аб праектах кадэтаў і трудавікоў выказаўся П.-М. П. Масэніус, які падкрэсліў, што ў выніку нацыяналізацыі сяляне атрымаюць не зямлю, а паперу пра яе [5].

Ва ўмовах абвастрэння пазадумскай барацьбы класаў царскі ўрад палічыў неабходным распусціць Думу, лічачы, што думскія дэбаты, асабліва па аграрным пытанні, робяць рэвалюцыянізуючае ўздзеянне, і ў першую чаргу на сялян. Ва ўказе ад 8 ліпеня 1906 года ўрад катэгарычна выказаўся пра недатыкальнасць памешчыцкай уласнасці на зямлю і роспуск Дзяржаўнай думы.

З пазіцыі высокаразвітых прамысловых дэмакратый у заканадаўчых актах ад 11 снежня 1905 года і ад 20 лютага 1906 года аб выбарах, складзе, парадку дзейнасці і кампетэнцыі Дзяржаўнай рады і Дзяржаўнай думы жадалася шмат лепшага. Аднак на фоне мінулага Расіі яны знаменавалі сабою вялікія крокі ў кірунку да дэмакратызацыі грамадства. Упершыню самадзяржаўе дазволіла выбарным прадстаўнікам народа ўдзельнічаць у заканатворчасці, абмяркоўваць дзяржаўны бюджэт, крытыкаваць існуючы лад і прыцягваць да адказнасці міністраў. І калі расійскі эксперымент не прывёў да супрацоўніцтва ўрада і грамадства, то прычынай з'явілася не столькі недасканаласць заканадаўчых актаў, колькі нежаданне ўрада і парламента успрыняць новы парадак і дзейнічаць у адпаведнасці з існуючымі магчымасцямі [6].

З красавіка 1906 года Дзяржаўная дума служыла трыбунай бесстрашкоднай і нястрымнай крытыкі рэжыму. І гэта, магчыма, больш падрывала прэстыж рускага ўрада ў вачах народа, чым усе дзеянні рэвалюцыянераў, бо пазбаўляла кіруючыя вярхі арэолу ўсемагутнасці, які яны імкнуліся захаваць.

## ЛІТАРАТУРА

1. Черменский Е. Д. Буржуазия и царизм в революции 1905 - 1907 гг. М.-Л., 1939. С. 91.

2. Первая Государственная дума: Алфавитный список и подробные характеристики членов Государственной думы. М., 1906. С. 8 - 11, 22 - 23, 40 - 43, 106 - 107.

3. Шабуня К. И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905 - 1907 гг. Мн., 1962. С. 176.

4. Государственная дума: Стеногр. отчет. Созыв 1: Сессия I: В 2 т. СПб., 1906. Т. 2. С. 886.

5. Тамсама. Т. 1. С. 385.

6. Пайпс Р. Русская революция: В 2 т. М., 1994. Т. 1. С. 180.

**М. В. Цуба**

## БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ РУХ НА ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ (1900 - 1914 гг.)

Стварэнне на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX стагоддзя партый сацыялістычнай арыентацыі Бунд і РСДРП, з аднаго боку, сведчыла пра слабасць беларускага нацыянальнага руху, з другога садзейнічала распаўсюджванню сацыялістычных ідэй і арганізацыі партый такога ж кірунку.

Акрамя таго, значная перавага вясковага, сялянскага насельніцтва абумовіла тут галоўную задачу - барацьбу за зямлю. Гэта барацьба даволі часта насіла востры характар і цесна злучала беларускі нацыянальны рух з аграрным. Так сталася гістарычна, што беларускія сяляне вялі змаганне за зямлю ў большасці выпадкаў супраць рускіх, абрусельх або польскіх ці апалячаных чыноўнікаў. І ў дадзеных абставінах радыкалізм сялянскіх мас амаль поўнасцю супадаў з мэтамі беларускага вызваленчага руху.

Гэтымі акалічнасцямі можна патлумачыць той факт, што на пачатку расійскай рэвалюцыі 1905 - 1907 гадоў на Беларусі ўжо існавалі дзве нацыянальныя партыі - Беларуская сацыялістычная грамада (БСГ) і Сацыялістычная партыя Белай Русі (СПБР) - менавіта сацыялістычнай арыентацыі, якія ў сваёй дзейнасці абапіраліся на сялянства.

Што тычыцца апошняй, то звестак пра гэту партыю засталося вельмі мала, не захавалася і яе праграмы. Вядома, што названая